Голас Радзімы

ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА
БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»

№ 42 (2236) 17 кастрычніка 1991 г. Выдаецца з 1955 г.

Цана 8 кап.

*У БЕЛАРУСКІМ ТАВАРЫСТВЕ "РАДЗІМА"*

# ПЕСНІ РАЗЫХОДЗЯЦЦА ПА СВЕЦЕ

Закончыліся штогадовыя курсы ўдзельнікаў і кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці з-за мяжы, што праводзіла Беларускае таварыства "Радзіма". Сёлета на курсах займалася дзесяць жанчын з Бельгіі і Польшчы, якія, па іх жа словах, каб пабылі разам не тры тыдні, а трошкі больш, маглі б скласці добры прафесійны ансамбль, накшталт тых, што яны бачылі і чулі ў Мінску.

Як заўсёды, курсы закончыліся справаздачным канцэртам і развітальным абедам. На канцэрце артысты паказалі ўсё, чаму навучыліся: спявалі беларускія фальклорныя песні, танцавалі "Полечку", "Кракавяк", "Лявоніху"; на абедзе мы пачулі ад іх словы падзякі за ўвагу і клопат, за магчымасць пабываць у Мінску, пазнаёміцца з мастацтвам Беларусі.

Тамара Ізотава, старшы метадыст Беларускага інстытута праблем культуры, якая курыравала работу курсаў, расказала, што іх установа імкнулася даць слухачам разнастайныя веды, якія дапамаглі б ім лепш зразумець народнае беларускае мастацтва, яго вытокі і сучасны стан. Навуковец М. Піліпенка на пачатку заняткаў прачытаў лекцыю аб узнікненні Беларусі, аб яе народзе як самастойнай нацыі з самабытнай мовай. Супрацоўніца Акадэміі навук Г. Барташэвіч расказала пра беларускі фальклор, прачытаны былі лекцыі і аб сучаснай беларускай песні. Многія лекцыі чыталіся на беларускай мове. Зразумела, што для нашых сяброўак з Беласточчыны тут праблем ніякіх не было, а вось Тацяне Абадзі і Паскаль Дэнеф спачатку даводзілася цяжкавата. Таня родам з Тамбова, зараз жыве ў Бельгіі, Паскаль — бельгійка.

— Але ўжо на другі дзень я пачала разумець беларускую мову, — гаворыць Таня. — Паскаль спатрэбілася трошкі больш часу. Самае каштоўнае, што я адкрыла для сябе беларускі фальклор і палюбіла яго. Вашы песні задушэўныя і мілагучныя, прыгажосць іх надзвычайная. Няхай яны шырэй разыходзяцца па свеце. Шчаслівая, што пабывала ў Мінску.

На абедзе прысутнічаў старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку Алесь Баршчэўскі. Ён шчыра падзякаваў Беларускаму таварыству "Радзіма" за запрашэнне беларускіх жанок, удзельніц мастацкай самадзейнасці, на курсы. Наогул, сказаў ён, таварыства "Радзіма" было першай беларускай культурнай арганізацыяй, якая працягнула руку дапамогі сваім беластоцкім суайчыннікам. Многа ёю зроблена для таго, каб у Гайнаўцы паўстаў Беларускі музей, ужо некалькі гадоў запар прыязджаюць сюды летам на адпачынак нашы дзеці, на курсы — спевакі і танцоры. Вялікі дзякуй за ўсё "Радзіме".

Першы намеснік старшыні прэзідыума таварыства "Радзіма" Мікалай Васілёнак павіншаваў гасцей з заканчэннем курсаў, пажадаў поспехаў у іх рабоце, запрасіў да далейшага супрацоўніцтва.

**Дзіяна ЧАРКАСАВА.**



Гэтым летам дзіцячы хор "Журавінка" мінскай сярэдняй школы № 130 прымаў у сябе хор равеснікаў "Белыя галасы" з італьянскага гарадка Санта-Джусціна. А зусім нядаўна юныя беларускія харысткі вярнуліся з паездкі ў Італію. Надоўга застануцца ў памяці сустрэчы з Італіяй, цікавыя экскурсіі, сустрэчы з італьянскімі равеснікамі, канцэрты. Майстэрства юных выканаўцаў пакарыла слухачоў. Узнёслымі воклічамі "брава", доўгімі апладысментамі і кветкамі заканчваліся выступленні мінчанак. Іншы раз рэлігійныя і беларускія народныя песні гучалі на імправізаваных пляцоўках проста на вуліцах, у саборах.

НА ЗДЫМКУ: у час выступлення ў адным з сабораў горада Трыеста.

Фота Ю. ПАЎЛАВА.





Гэтыя два здымкі Антона БАЛІЦКАГА нібы сімвалізуюць пачатак і канец шляху чалавека, які прыняў камуністычную ідэю і паверыў у тое, што Савецкая ўлада зробіць шчаслівым і адукаваным яго народ. Антон Баліцкі поўны рэвалюцыйнага аптымізму (здымак справа), і ён жа — знішчаны як асоба д'ябальскай малатарняй сталінскіх рэпрэсій (фатаграфія зроблена ў турме).

Сёння мы друкуем (на 3-й стар.) апошні раздзел нарыса А. Караля "Нарком беларускага адраджэння".

# ЖЫЦЬ РАЗАМ, АЛЕ КОЖНЫ СВАІМ УКЛАДАМ

**ГУТАРКА РЭДАКТАРА ГАЗЕТЫ "ГОЛАС РАДЗІМЫ" Вацлава МАЦКЕВІЧА З НАРОДНЫМ ДЭПУТАТАМ СССР Міхаілам САВІЦКІМ.**

**Мне неаднаразова даводзілася браць інтэрв'ю ў Міхаіла Савіцкага па праблемах супрацоўніцтва з эміграцыяй (ён, як вядома нашым чытачам, старшыня прэзідыума Беларускага таварыства "Радзіма"), мае калегі гутарылі з ім як з мастаком (Міхаіл Андрэевіч — правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР, доўгія гады ўзначальваў Саюз мастакоў БССР). На гэты раз прыйшла думка правесці з ім дыялог як з грамадскім дзеячам, палітыкам, бо Міхаіл Савіцкі — народны дэпутат СССР, а да гэтага быў дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі двух скліканняў. Так што намер мой, лічу, не беспадстаўны: палітычны багаж М. Савіцкага даволі важкі. Ведаю, што з яго думкай лічыліся ў нашых "вярхах", хаця і не заўсёды яе падзялялі. Часта яго проста цярпелі і лёгка дакаралі за рэзкія выступленні на розных камісіях Вярхоўнага Савета БССР.**

**Мае асабістыя дыскусіі ў яго майстэрні за шклянкай чаю былі доўгімі, але не нуднымі. Наадварот, час праляталў, бы імгненне, і я развітваўся з Міхаілам Андрэевічам радасна ўзбуджаны, уведаўшы новы, зусім іначшы пункт гледжання на, здавалася б, як свет, старыя ісціны. Не кожны раз я пагаджаюся з меркаваннем Савіцкага, але заўсёды паважаў і паважаю яго думку, бо яна шчырая.**

*— Міхаіл Андрэевіч, ужываючы ў нашай публіцыстыцы ды і ў палітычнай палеміцы выраз "гістарычная падзея", мы, бы ў той непатрэбнай штодзённай мітусні імя Божае, вымаўляем яго часцей не да месца, чым да месца. У нас, і не толькі цяпер, усё — гістарычнае, эпахальнае. Але я асмелюся сцвярджаць, што не вазьму граха на душу, калі скажу, што вы былі ўдзельнікам сапраўды гістарычнай падзеі — прысутнічалі на V нечарговым з'ездзе народных дэпутатаў СССР, на якім адбыўся распад нашага Саюза. Скажыце, толькі шчыра, СССР рассыпаўся?*

— Сам з'езд сабраўся ва ўмовах, калі Саюз ужо распаўся.

(Заканчэнне на 7-й стар.).




**153**

— І ты здольны на такое каханьне? — засьмяяўся Кірыла. — Кінь ты, не сьмяшы людзей.

— Я? — крыху абразіўся Тугоўскі. — Так ты лічыш, як і ўсе нашыя беларусы лічаць мяне, напэўна, няздольным ні да чаго? Не, брат, я належу да тых людзей, якія здольны на ўсялякія бязумства. Слабыя людзі моцныя сваім адчаем. І сяньня, калі я ў адчаі, я моцны.

— Кінь ты, Гамлет няшчасны! Зноў ты пачынаеш плясьці дурніцы. Выпій піва лепш, супакойся.

— Ах, "айцец" Кірыла! Справа ня ў Гамлеце, ня ў піве, справа ў маім жыцьці... У мне самім... Паслухай мяне. За піўным сталом заўсёды лепш кідаць філязофскія думкі й спавядацца. Дык вось... Мне здаецца, што я маю права рваць яблыкі ў тым садзе, які завецца жыцьцём. Тысячы розных сартоў яблык у гэтым садзе, толькі ўмей іх зрываць. А між тым не зрываю... Калі прыдзе ноч і я застаюся адзін, я думаю: "Чаму?" Я пытаю сябе: "Чаму?" І я адказваю цяпер: "Таму, што мяне ніхто не кахае..." Ня сьмейся, "айцец" Кірыла, ня сьмейся. Гэта факт. Каханьне — гэта атэстат сьпеласьці, які выдае жанчына мужчыне. Там праставляюцца розныя адзнакі за яго посьпехі і здольнасьці: там відацца, хто зьяўляецца найбольш здольны, каму даць сярэбраны ці залаты медаль. Чым больш у гэтым пасьведчаньні медалёў, тым, знача, больш здольны чалавек, тым больш кахае яго жанчына. Раней, чалавеча, у маёй моладасьці, я думаў, што бегаюць за жанчынамі пустыя людзі, без творчай карыснай працы. Тады я ня мог глядзець на іх інакш, як зьверху ўніз, але цяпер усё зьмяшалася: я гляджу на іх зьнізу ўверх. — Ён глытнуў крыху піва й прадоўжваў: — Я цяпер ведаю, што чым больш кахае жанчына мужчыну,

**154**

тым ён здольнейшы, тым лепшы яна выдае яму атэстат.

— Дурніцы! — перабіў яго Кірыла. — Хіба мала на сьвеце дуракоў, якіх кахаюць жанчыны, мала п'яніц азартных, гуляк жанатых. Дык наогул ёсьць розныя жанчыны, і іх ацэнка ня можа быць зусім аб'ектыўнай — яна заўсёды будзе суб'ектыўнай. Так, напрыклад, нямала ёсьць жанчын-п'яніц... Знача, яна будзе цаніць у мужчыны тыя самыя якасьці, што і ў самой сабе.

— Ня ведаю. Але мне здаецца: ёсьць мужчыны, каторыя падабаюцца жанчынам без вынятку. У іх ад прыроды ёсьць такія "мужскія" якасьці, што яны прымушаюць біцца любое жаночае сэрца. Агулам я хачу даказаць, што людзі са здольнасьцямі могуць мець самую прыгожую жанчыну на сьвеце. Паглядзі, які-небудзь музыкант, інжынер, вучоны, словам, той, аб якім перадаецца з вуснаў у вусны, — як пакарае ён жанчын, як кідае ён іх бы кветкі і ляціць у новыя абоймы. Цяпер вазьмі другую крайнасьць: які-небудзь дурань, які выклікае толькі насьмешкі ад гэтых самых жанчын, як адпіхіваюць яны яго самыя шчырыя прызнаньні, як ганебна адкідаюць яго пачуцьці. Словам, жанчына жыве агульнай тэорыяй, яна фактычна кахае не мужчыну, а яго грамадскае палажэньне. Праўда ці не? Я думаю: будзь ты самым першым прыгажуном у сьвеце, але служы ты ў абозе, ні адна жанчына не гляне на цябе. І, наадварот, будзь ты самым уродам, але займай міністэрскае крэсла, — ты не адаб'ешся ад чароўнага полу. Такім чынам, мне здаецца, ясна, што жанчыны кахаюць не самога мужчыну, а толькі яго палажэньне ў жыцьці. І вось таму я кажу, што жанчына — гэта нейкі барометр, па якому можна азначыць

**155**

грамадзянскую вартасьць чалавека, і каханьне — гэта атэстат вартасьці, які яна выдае. Па каханьню можна ацаніць чалавека. Скажы, хто цябе кахае, і я скажу, хто ты.

Кірыла галасна расьсьмяяўся:

— Філязоф-самавука, — казаў ён праз сьмех.

— Ня сьмейся, "айцец" Кірыла, — усьміхаючыся таксама, зазначыў Тугоўскі. — Кожны пасвойму разумны. Адно табе скажу я: вельмі нізкае грамадскае палажэньне такога, хто ня быў каханы. Я цьвярджу, што якая-небудзь "старая дзева" абсалютна нуль у параўнаньні з тэй жанчынай, якая выйшла замуж і стала маткай, бо ў ей было шмат недахопаў, якія не дазвалялі ей кахаць. Тое самае: грош цана таму чалавеку, які на ўсё жыцьцё застаўся халасьцяком.

— Мне здаецца, твая памылка ў тым, што ты абагуліваеш тое, што зьяўляецца выпадковым, асобныя факты ўвазводзіш у закон. У гэтай запутанай цямніцы, якой зьяўляецца палавое пытаньне, цяжка выводзіць што-небудзь агульнае. Напрыклад, ёсьць "старыя дзевы", застаўшыяся выпадкова такімі. Можа быць яны былі шмат вышэй за тых жаніхоў, якія іх сваталі, за той асяродак, у якім яны жылі. Па-майму, лепш зусім не выходзіць замуж, чым выходзіць абы-як. Ты глыбока памыляешся. Але наогул скажы ты мне, для чаго ты гутарыш на гэтую тэму? Мне дагэтуль няясна, які вывад ты хочаш зрабіць.

Тугоўскі маўчаў.

— Мне здаецца, адзіны вывад, — прадоўжываў Кірыла, — што каб кахаць і быць каханым, трэба зрабіць добрую карду[1].

— Вось праўду кажаш, "айцец" Кірыла, — прамовіў Тугоўскі, ставячы куфаль на стол. — У

**156**

наш капіталістычны век запраўды так: каб быць каханым, трэба мець капітал або займаць высокае палажэньне на грамадскай драбіне. Але ў тым вось і бяда, што я не магу йсьці па шляху нашых беларускіх студэнтаў у Празе. Адзін хоча стаць інжынерам, каб разбагацець і пакахаць графіню. Другі — пабудаваць уласную вілу, трэці — стаць доктарам і купіць уласны аўтамабіль. Кожны думае аб сваей кар'еры. На жаль, у мяне гэтых думак няма, бо, каб у мяне гэтыя думкі былі-б, напэўна, я быў-бы больш шчасьлівым, зрабіў-бы кар'еру, разбагацеў-бы, як іншыя, і знайшоў-бы нарэшце прадмет каханьня. А зараз я памёр: я кінуў вышэйшую школу, бо яна рыхтуе толькі кар'ерыстаў і лёкаеў для капіталістаў, да чаго калісьці заклікаў залатазубы прафэсар палітычнай эканоміі. Я кінуў той прадмет каханьня, які таксама, мне здаецца, думае аб кар'еры й аб мужу-кар'ерысту. Я вырваў з болей сваё каханьне, кажу табе шчыра, "айцец" Кірыла. З болей пакінуўшы ў сваім сэрцу глыбокую рану, якая вечна застанецца са мной, пакуль будзе цячы кроў у жылах. Я памёр для гэтага сьвету, памёр для інтэлігенцыі, якая панясе эўрапейскую панскую культуру на Беларусі. Я сам сябе зажыва пахаваў у яму, каб я ня стаў тым, каго болей усяго ненавіджу: інтэлігентам, які ненавідзіць рабочых, бо яны сьмярдзяць. Ня ведаю, што такое творыцца са мной; можа быць я вар'яцею, але я кахаю ўсіх, чалавека паніжанага й абражанага. Сам я паніжаны й абражаны, сам я ўсё жыцьцё рос у склепах, пад падлогай тых, хто саладзіўся жыцьцём, сам я насіў на сваім твары пляму "плябей", і таму як мне не стаць у шэраг паніжаных і абражаных? Так, чалавеча, я звар'яцею. Я стану работнікам — у той час, як сябры

**157**

зробяцца капіталістамі. Праз шмат гадоў, калі я пайду па вуліцы ў чорнай куртцы работніка, я, напэўна, убачу дом Бурака, можа вілу Тамашэвіча ці Станкевіча, убачу вялікія фіранкі на вокнах, убачу, як будзе стаяць Бурак з сваей прыгожай жонкай і будзе глядзець на вуліцу. Убачу, як Бурак пазнае мяне і з трывогай адвернецца да сваей жонкі, пытаючы яе паглядам: ці не пазнала яна таго, хто быў яго сябрам. А я пайду міма, міма... Але я ня буду шкадаваць гэтага, "айцец" Кірыла. Вып'ем за маю сьмерць! Ну, падымай куфаль за духовую сьмерць Тугоўскага!

Кірыла маўчаў. Ён задумана глядзеў у туманную піўную жыжку ў шклянцы і нешта крэсьліў на мокрым сьляду піва пальцам на стале. Ён доўга маўчаў.

— Ты паэт, Тугоўскі, — нарэшце вымавіў ён. — Гэтым усё сказана. І ў гэтым тваё няшчасьце. Паэт не такі, які творыць сабе славу й славу свайму народу вершам, але паэт па натуры, па свайму ўспрыманьню сьвету, па свайму падходу да жыцьця. Ты безумоўна загінеш... А шкада, мне ўсё ж ткі падабаецца твой падход да сацыяльных пытаньняў, да работніка. — Ён хлібнуў некалькі глыткоў піва.

— Чаму я загіну? — трывожна запытаў Тугоўскі.

— Ты зрабіў велізарную памылку, што пакінуў унівэрсытэт. Памятаеш, як табе казаў калісьці астральны чалавек: "Канчайце унівэрсытэт. Атрымайце дыплём. Інакш вас затруць дыплёмаваныя дурні ў жыцьці. Памятаеш гэта? І ты не паслухаў. Ты паэтычна падыйшоў да ідэй, да таго самага залатазубага прафэсара, ты занадта блізка прыняў да сэрца яго сьцьверджаньні й паэтычна абурыўся. Ты занадта паэтычна аднёсься

**158**

да Вярхоўскай. Падумай, каго там кахаць? Па-майму, гэта толькі пахучы кавалак мяса. А ты паэтычна ідэалізаваў яе, ты закахаўся ў яе — што з-за яе пайшоў-бы скочыць як баран у ваду.

— Не, брат, Вярхоўскай ты ня ведаеш, — абараняўся Тугоўскі. — Аб ей мы ня будзем гутарыць... Не хачу хаваць, што з-за яе я галоўным чынам кінуў унівэрсытэт, што калі-б яна кахала мяне, я гатоў-бы прынасіць сябе нават у ахвяру й зрабіць якую-колечы кар'еру, як іншыя беларускія студэнты. Можа быць, ня ведаю. Але цяпер унівэрсытэт для мяне на замку: я хачу апрасьціцца. Я даўно хацеў апрасьціцца. Вярхоўская толькі дапамагла мне ў гэтым, разьбіўшы мае апошнія надзеі. Вярхоўская была-бы местам, злучыўшым мой сьвет работніка з тым сьветам інтэлігента. Мне да апошняга часу яшчэ здавалася, што гэта магчыма. Я думаў праз сябе апрасьціць Вярхоўскую. Я думаў: яна пакахае мяне як чалавека. Але я бачу, што для яе я павінен таксама стаць кар'ерыстам, таксама, скончыўшы унівэрсытэт, павінен стаць панам, запамятаць аб сваім сацыялізме і купіць сабе аўтамабіль. Не... Не хачу... Я яшчэ знайду ў сабе досыць сілы, каб адкінуць такое жаданьне. Я памёр для тых, хто прывёў мяне ў Прагу, каб я вяртаўся назад прафэсарам. Аказываецца, з мяне выйшаў не прафэсар — брадзяга... Дык вып'ем за новага Тугоўскага! За новага чалавека, які пойдзе ў народ, каб самому стаць народам, а?.. Падымай куфаль...

---

**Працяг.**
**Пачатак у №№ 23 — 41.**

**159**

— Не... Не... За брадзягу Тугоўскага? Не... Я падымаю свой куфаль за Тугоўскага-прафэсара.

— І ты, "айцец" Кірыла, — схапіў за яго руку Тугоўскі, — і ты належыш да таго лагера, да тых інтэлігэнтаў? Знача, і ты, жывучы ў Празе, ува ўсім разачараваўся, — ува ўсей беларускай справе, ува ўсім народзе; знача і, па-твойму, трэба зрабіць кар'еру?

— Так, чалавеча, каб біць буржуазію, трэба мець яе аружжа ў руках — культуру. Без гэтага ўся наша зброя — толькі кардонны меч, якім мы па-дзіцячаму размахівалі ў паветры.

Яны зноў пачалі спрачацца. Яны не прыкмячалі, што іх спрэчкі рабіліся ўсё больш і больш плутанымі.

Тугоўскі першы пабачыў, што іх спрэчкі ні да чаго не прыводзяць і што ён сам увесь быў сатканы з гэтых супрэчнікаў.

— Вып'ем, "айцец" Кірыла, усё ж ткі за маю сьмерць. Вып'ем за маю будучую жонку — простую сялянку.

— Во, за тваю жонку-сялянку п'ю. Проці гэтага нічога ня маю. Я думаю, што ты можаш быць прафэсарам і мець жонку-сялянку.

— Не, я хачу знайсьці такую жанчыну, якая кахала-б мяне як чалавека, незалежна ад таго, якое палажэньне я займаю. Без каханьня, без жанчыны я жыцьця сабе ня ўцямлю... Я хачу яшчэ выпіць гэтую чару каханьня да дна.

— Паэт ты, Тугоўскі, паэт... У гэтым тваё няшчасьце, — паўтараў Кірыла. Яны выпілі апошні куфаль.

Калі яны ўсталі ад стала, зямля акрэслена калыхалася пад іх нагамі. Над імі вісеў на якары перад уходам у піўную вялікі гадзіньнік з пры-

**160**

гожымі стрэлкамі. Ён паказываў далёка за поўнач... Кірыла расстаўся:

— Я думаю, ты не паедзеш з Прагі, — казаў ён, паціскаючы руку Тугоўскаму, — я думаю, мы цябе яшчэ ўлаштуем на стыпэндыю.

— Не, "айцец" Кірыла, дзякую за ласку. Усё скончана. Я еду на гэтых днях на Бацькаўшчыну. Шчасьліва заставацца.

Яны пайшлі рознымі дарогамі.

## IX

Студзёнае марознае паветра гнала капялюш з галавы Тугоўскага. Ён ішоў па шумных асьветленых вуліцах апошні, як яму здавалася, раз, стараючыся ўдыхаць арамат начнога жыцьця вуліц. Ісьці дахаты яму не хацелася. Інтэрнат здаваўся пеклам, у якое ён папаў для пакуты. Ён ішоў і бачыў, як усё жыцьцё начной Прагі круцілася каля аднаго цэнтру — жанчыны. Усе дбалі аб ей, усе ішлі з ей, усе шукалі яе. Ён зноў пачуў сябе адзінокім... Ён успомніў, што ўцёк да "Флэка" таму, што на карнавале пабачыў Вярхоўскую з Загорскім. Як весёла цяпер у Студэнцкім доме. Як, напэўна, сьмяецца Загорскі, цалуючы яго каханьне... А ён ідзе ўсё таксама адзін, не маючы магчымасьці схапіць яе ў свае абоймы... Няўжо гэта так будзе вечна? Ён ішоў й успомніў надпіс "У Флэка" пра дары каханьня. Для каго гэтыя дары?

---

[1]Карду — кар'еру.

**LECCIONES DE LA HISTORIA**

# REVOLUCION, DEMOCRACIA, DICTADURA

La actual situación en la URSS se parece muchísimo al victorioso final de la lucha por la independencia en América Latina. En aquel entonces se creía que al ser expulsados los colonizadores la libertad se impondría por doquier. El hecho de que los pueblos liberados tuviesen el territorio, el idioma, la religión, las costumbres y el destino histórico comunes predeterminaron las resoluciones del Congreso de Panamá del año 1826 e impulsaron la unión dentro del marco de toda América Latina o, al menos, dentro del marco de toda Hispanoamérica. ¿Pero qué ocurrió en la realidad? La oleada de declaraciones de soberanía arrastró al continente a la gran revuelta. La libertad se ahogó en la sangre de latinoamericanos, derramada en infinitas guerras civiles. Sobre las ruinas de las formaciones antes unidas crecieron las dictaduras de Santa-Anna, de Rosas, de Portales, de García Moreno, de Carrera, del inolvidable doctor Francia y de todo un panteón de déspotas haitianos, dignos precursores de "papá Duvalier". La lista de nombres es demasiado larga para considerarla casual.

Ya la propia revolución encierra la probabilidad de semejantes "percances", ya que conduce a la desintegración de la sociedad vieja, a la renovación de sus componentes (clases, estratos, grupos, partidos, regiones) y a la agudización de las contradicciones entre tales componentes. Esas contradicciones van haciéndose más agudas a medida que aumentan las ambiciones reformistas de los revolucionarios, como les ocurrió a los liberales de Latinoamérica, que se pasaron de la raya, tras la cual ya no era posible reconciliación alguna. En tales casos la libertad de unos priva inevitablemente de libertad a otros y se torna en anarquía, en impotencia absoluta de las instituciones democráticas recién creadas. Así salen a la arena política los conservadores, presentándose como salvadores de la patria.

Los revolucionarios suelen catalogarlos como fuerzas reaccionarias aunque los verdaderos conservadores no son representantes de las clases derrocadas, sino parecen entre los propios revolucionarios, como ocurrió en la mayoría de los casos de los dictadores antes mencionados. Además, su tarea no consiste en procurar que la sociedad vuelva al estado revolucionario, sino en conservar la sociedad, en recuperar su unidad, en cimentar los fragmentos de ésta. Pero tal hecho tampoco es consolador, ya que sabemos bien que los recursos de tal salvación es el entierro de la democracia en general, la apelación al nacionalismo, la búsqueda de enemigos internos y externos, el retroceso de las reformas hasta el punto en el cual se cruzan el pasado, el presente y el futuro de esta sociedad.

La peculiaridad del golpe de Estado del mes de agosto consiste en que éste fue realizado por reaccionarios, pero bajo consignas conservadoras. El putch se produjo en el momento, cuando la firma del Tratado de la Unión según la fórmula 9+1 cifraba en la sociedad la esperanza de que se encontraría una salida de la crisis. Por lo visto la quiebra de los mecanismos del poder del PCUS atenuará la amenaza de la restauración del totalitarismo a escala de todo el país. Por otra parte, al torpedear la firma del Tratado de la Unión y al aumentar las tendencias centrífugas en las repúblicas el putch incluso aumentó la posibilidad del surgimiento de un nuevo movimiento conservador. Se dice que la historia jamás enseña lo que se necesita hacer, pero sí advierte lo que no conviene hacer. Si ello es cierto, tenemos que hacer lo posible para no repetir la experiencia latinoamericana del siglo pasado. Además, en el caso de los pueblos soviéticos no hay comunidad de idiomas, de religión ni de costumbres. Sólo hay territorios en litigio y grandes arsenales nucleares.

En este sentido una gran responsabilidad recae en los demócratas de Rusia, en los cuales ciframos muchas esperanzas. Lo digo no sólo porque ellos hicieron el aporte decisivo a la derrota de los golpistas, sino también porque son ahora casi el único destacamento de las fuerzas democráticas que en esta situación de euforia general aún conserva el sentido común. Espero que el reconocimiento de la independencia de las repúblicas, los esfuerzos para concertar el acuerdo sobre el espacio económico único y la solución operativa de los problemas en litigio con Ucrania y con Kazajstán le permitirán a Rusia acelerar las reformas indispensables en la república propia y ayudar a la edificación de la URSS renovada. Y no importa que nuestros problemas reales, a los cuales alegaban los golpistas, sean tan sólo una consecuencia del sabotaje por parte de las estructuras viejas, como creen los demócratas de Rusia. Lo importante es que ellos no se olviden de la tesis fundamental del conservadurismo, tan cierta, como desagradable para los revolucionarios de todos los pueblos y tiempos. Esta tesis consiste en que las personas, que forman la sociedad, no son tabula rasa, sino portadoras de la cultura material y espiritual de las épocas anteriores y no pueden tachar su pasado y comenzar una vida nueva, por lo cual esatrán condenados al fracaso todos los intentos de edificar un mundo nuevo, destruyendo hasta los cimientos el viejo.

**Nikolái MARCHUK,**
**candidato a doctor en Historia**





*En la región de Dóbrush hay un pequeño territorio que pertenece a nuestro vecino Rusia. Antiguamente estas tierras eran propiedad del príncipe Paskévich quien las vendió después. Y por las veleidades de la suerte las aldeas Sáñkovo y Medvezhie quedaron pobladas por los campesinos rusos y actualmente integran un koljós de la provincia de Briansk, el centro del cual se encuentra a 7 kilómetros de las mismas. A su vez Iatki y Dubetskóe, aldeas bielorrusas, están muy cerca. De esta manera en el transcurso de muchos decenios los rusos y bielorrusos viven codo con codo sin preocuparse de sus fronteras y nacionalidad. Y lo único que no pudieron resistir fue la tragedia de Chernóbil. Hoy los vecinos de dicha zona, tanto rusos como bielorrusos, deben abandonar sus casas paternas para siempre siendo afectadas éstas por la radiación.*
*EN LAS FOTOS: esto es la tierra de Rusia; aduana bielorrusa: por delante está situada Rusia, por detrás están Sáñkovo y Medvezhie, dos aldeas rusas; últimas noticias...*

*Foto: S. JOLODILIN*



# FUGA DE CEREBROS

Entre nosotros se ha formado el este reotipo de que si un soviético (sobre todo un especialista de alta calificación) viaja al exterior, tratará de quedarse para siempre allí, pues sólo allá hará gala de todas sus capacidades. La práctica mundial enseña que un porcentaje muy grande de emigrantes están predispuestos al retorno y, de no existir obstáculos, quisieron regresar a la patria. Más aún, al marcharse, se plantean el objetivo de ganar dinero y, luego de aprender algún oficio, regresar, pero ya en una nueva calidad. Digamos, crear su propia cooperativa, pero ya a la última moda.

Pero quienes se instalan en el extranjero, especialmente los intelectuales, también viajan a la patria. Y son tantas las obras de autores rusos residentes en el extranjero que se publican en nuestro país; quienes siguen sus visitas saben que no intentan llevarse las valijas repletas de dinero por sus actividades. Por lo contrario, muchos entregan sus honorarios para los propósitos más nobles: a las víctimas de Chernóbil, la lucha contra el SIDA, los inválidos de la guerra afgana, etc. Dicho sea de paso, los chinos con residencia permanente en el exterior ayudan a China de hoy, es decir, los empresarios privados ayudan a los organismos estatales en el comercio, el transporte, la esfera de finanzas. Y eso a pesar de que muchos no se proponen regresar y sostienen los más diversos criterios. La mayoría de los países con una gran diáspora no dejan de utilizarla, de manera absolutamente abierta, como apoyo en su política y comercio, diplomacia y periodismo, contactos culturales y humanos. Para practicarlo sólo hacen falta dos factores. Primero, que la comunidad en el exterior sea lo suficientemente numerosa, que se la puede agrandar con nuevos integrantes, y, segundo, hay que saber trabajar con la misma.

Mas no vale pensar que la comunidad de emigrantes, especialmente su proporción intelectual, sólo sirva de fuente para obtener dinero. Es necesario ayudar a esta comunidad, ante todo, a los intelectuales. Pero nuestras embajadas no se inclinan a invitar a nuestra intelectualidad en el exterior a sus raras recepciones diplomáticas, mientras que nuestras representaciones comerciales no se apuran para atraer a los compatriotas a la actividad económico-comercial conjunta, aunque el solo nombre de fama ya forma un "capital". ¿Cuándo, por fin, nuestros emisarios responsables en el exterior entenderán que se debe cooperar enérgicamente incluso con los compatriotas que carecen de ciudadanía soviética, sin hablar de los demás? En definitiva, el país saldrá ganando con eso.

Mientras tanto, los emigrantes necesitan ayuda, incluso quienes a nuestro juicio son altamente retribuidos. Y, precisamente porque no la brindamos, les resulta más difícil de todo ocupar su lugar en la jerarquía profesional en el exterior.

Creo que es imposible retener la mano de obra, sobre todo a los especialistas calificados. Justamente por esta razón valdría la pena regular el flujo espontáneo y armonizarlo a costa de rotación, manteniendo la cuota permanente de cuadros calificados en uno u otro país. Se conoce que los países que reciben a los especialistas calificados, tienen determinada demanda de ellos, la cual, una vez satisfecha, puede desorganizar el mercado del trabajo calificado. (A propósito, también en este aspecto no tenemos iguales, porque la URSS es el único de todos los países que dice pertenecer al mundo civilizado, pero que no aumenta en absoluto su cuerpo intelectual a costa de otros estados). Precisamente merced a esta circunstancia, la cuota que coordinarán los países en cuanto a los especialistas y científicos que salen cada año para trabajar por contrato, no permitirá "vaciar" nuestra ciencia, industria, educación, cultura y salud pública. Semejantes medidas se determinan usualmente por convenios intergubernamentales bilaterales. El trabajo que efectuarán durante un período concreto los científicos, ingenieros, actores, médicos, maestros y otros cuadros de alta calificación ayudará al país donador (es decir, a nosotros) adaptar los cuadros intelectuales (por el medio más barato) a los métodos contemporáneos del trabajo, a la comunicación profesional. La retribución del trabajo en estos organismos les permitirá aumentar su presupuesto familiar. A su regreso a la URSS no sólo podrán trabajar con mayor rentabilidad, sino que traerán consigo algunos medios de producción (ordenadores, autos, herramientas, artículos de oficina, etc.), que harán aumentar en varias veces la productividad de su trabajo.

**Andréi KAMENSKI**

**Redactor de la página K. SHELESTÓVICH**

# «АПОШНІ СВОЙ СКАРБ АДДАЮ»

## *ДА 100-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Максіма БАГДАНОВІЧА*

І ля паднятых у неба крыжамі ялін "самаўскрыжаваўся" на вяршынях вялізных сасон паганскі дэман лесу, каб узнесціся з балота, лясной трасіны ў чысціню сіняга неба для новага жыцця, — выратавання ў дабры. Ахрысціў дзікую душу, каб стацца душою добраю, жыватворным духам-ветрам, павевы якога вясновай парой адраджаюць прыроду, абуджаюць у ёй жыццё.

У кароткім уступе да заключнай часткі лясной сімфоніі Багдановіч па правілах рэпрызы ўзнаўляе адзін матыў пастаральнага малюнку з экспазіцыі, але тут жа дабаўляе да яго новы, музыкальны элемент, які пазней стане асноўнай тэмай цыклічнага завяршэння: "Сосны, елі, хвоя, хвошчы, // Цёмны мох, // Чую я — лясун касматы // Тут залёг. // Паваліўся ён на хвою, // На кару // І ўсім калышэць, дзвіжэць // У бару".

Герой цыкла тут яшчэ захаваў сваю паганскую "касматасць", але ён ужо не гукае і не рагоча, а вочы яго ўжо не "загараюцца кроўю". Ён цяпер набыў аблічча антычнага Пана з жалейкай у руках. Ён рытмічна "ўсім калышэць, дзвіжэць у бару", і гэтыя рытмічныя рухі як паўза, за якой прадчуваецца музыка. Урэшце, у заключным вершы цыкла загучаў накцюрн — боская музыка начных лясоў, палёў, азёр і рэк: "Чуеш гул? — гэта сумны, маркотны лясун // Пачынае няголасна граць: // Пад рукамі яго, навяваючы сум, // Быццам тысячы крэпка нацягнутых струн, // Тонкаствольныя сосны звіняць. // Ці казаць, ад чаго пацямнела рака, // Зашамрэлі мацней каласы // І аб чым шэпча ім галасок вецярка, // Што зіяе-дрыжыць на лісцёх лазняка: // Кроплі слёз ці халоднай расы?"

Танкастволыя сосны — крэпка нацягнутыя струны, а лес — боская арфа, і музыка яе на крыллях вецярка напаўняе ўсё наваколле. Адбыўся цуд: матэрыя адуховілася, малюнкі перайшлі ў напевы музыкі, а кроплі слёз халоднай расы сталі яе сімваламі.

. Гэта — зусім інакшы, хрысціянскі музыка, і звязвае яго з антычным Панам толькі жыццядайная сіла начной расы. Але не яго цялеснай, жывёльнай прыроды, а духоўнай, ахрышчанай іпастасі. Пластычныя, паганскія малюнкі першых частак ляснога цыкла ў заключэнні цалкам растварыліся ў музыцы. Мы не бачым і самога Лесуна, а толькі чуем яго чароўны накцюрн.

Тэматычна да цыкла "У зачараваным царстве" прымыкае Багдановічава пейзажная лірыка, паэтычныя накцюрны і медытацыі пра быццё чалавека ў прыродзе і зорным космасе, якія не ўвайшлі ў "Вянок" альбо ствараліся ўжо пасля выхаду ў свет гэтай кніжкі. На прыкладзе "лясных" вершаў паэта, калі іх аб'яднаць у адзін цыкл "Лясун", можна пераканацца: мастацкая думка паэта развівалася ад жывапісных пейзажных эцюдаў і сімвалічных вобразаў народнай міфалогіі да іх музыкальнага сінтэзу ў заключным творы на гэтую тэму. Іншыя тэмы і матывы зачараванага царства развіваюцца па таму ж самаму ўзору, самабытна вар'іруючы выяўленне жывой, духоўнай існасці прыроды. Міфалагічныя ўвасабленні дазваляюць паэту стварыць абагулены сімвалічны вобраз той ці іншай прыроднай з'явы, затым перайсці да слухання яе цішыні альбо негалоснай элегічнай музыкі, каб у рэшце рэшт уключыць яе ў свет гарманічнага, драматычнага, нярэдка і трагічнага быцця чалавека (трохчасткавыя вершавыя цыклы "Вадзянік", "Змяіны цар" і інш.).

На першым этапе беларуская адраджэнцкая паэзія праходзіла сімвалічную стадыю свайго развіцця. Сімвалічную — у гегелеўскім, змястоўным значэнні гэтага слова. Тады духоўны сэнс і сацыяльная існасць тых драматычных працэсаў, у якіх адбываліся пад'ёмы і спады жыццядзейнасці нацыі, выяўляліся ў нашай паэзіі звычайна не ў адэкватных ім паняццях і вобразах, а праз іх сімвалічнае абазначэнне, напрыклад, стадыямі гадавых і сутачных цыклаў.

Восень і зіма, вечар і ноч у нашых паэтаў пэўны час былі сацыяльна-бытавымі сімваламі, знакамі ночы і зімы ў чалавечым жыцці і ў нацыянальным быцці народа. У Янкі Купалы знойдзецца нямала лірычных вершаў пра сваю, а гэта значыць, і нашую ўласную раніцу, вясну і ноч, як і свой "Вечар": "Мой вечар, знаю, блізка, недалёка — // Ёсць раніца — павінен й вечар быць..."

У Купалавых паэмах ("Зімою", "У піліпаўку", "На куццю", эпілог паэмы "Курган") і драмах "Адвечная песня", "Сон на кургане", "На папасе"), у лірыцы Коласа захавалася фальклорная сімволіка дня і ночы, вясны і зімы як увасабленняў добрага і злога пачаткаў быцця. Адным словам, на зіме і ночы заставалася нейкае пракляцце, як быццам бы нячысцік пазначыў іх сваімі заломамі.

Праз лірыку М. Багдановіча наша літаратура адкрыла эстэтыку змяркання, вечара, начной і зімовай іпастасяў быцця. Ноччу змякчаецца апазіцыя неба і зямлі, яны набліжаюцца і сіметрычна адлюстроўваюць сваю процілегласць.

Паэт адчувае і перадае чытачу паўнату і таемнасць начнога жыцця, а сваю зачараванасць нябеснай зорнай рунню выяўляе ў форме метафары-міфалагемы: "Ці не згубіў плывучы сон // З чырвоных макаў свой вянок?" Ізноў, як раней, у цыкле вершаў пра Лесуна, паэтавыя малюнкі непрыкметна пераходзяць у чароўную музыку паўтонаў, адбываецца цуд тварэння начной, вечаровай і зімовай санат. Але цяпер паэтычная міфалогія рэдуцыруецца, яе вобразы пераплаўляюцца ў метафары. Павевы ветрыка прыводзяць у рух малюнкі начной прыроды, малюнкі пераходзяць у ціхую начную музыку: "Добрай ночы, зара-зараніца! // Ужо імгла над зямлёю лажыцца, // Чорнай рызай усё пакрывае, // Пылам зор небасхіл абсявае. // Цішыня агартае мне душу. // Вецярок прыдарожную грушу // Ледзьве чутна варуша-калыша. // Міла бомы смяюцца у цішы, // Ціха срэбрам грукае крыніца..."

Чым прываражыла "сінявокая ноч" сэрца паэта, які прадчуваў свой кароткі век? Чаму ноч поруч з маці-радзімай стала гераіняй яго цудоўных песняў-малітваў? Ці не таму, што ў час начнога змяркання, у пару мяккага зорнага святла душа чалавека вызваляецца ад будзённай мітусні, наступае час сузірання і роздуму, час паэзіі і музыкі? Добра вядома, што Багдановіч, паэт свецкі, пазбягаў клерыкалізму, часам падсмейваўся са схільнасці некаторых пісьменнікаў і публіцыстаў да паэтызацыі рэлігіі. І ў той жа час, мабыць, больш за іншых бачыў у прыродзе духоўную першааснову, дасканала-прыгожае тварэнне Сусветнага Мастака. Нават нярэдка набліжаў свае вобразы-метафары да малітоўна-храмавага дзейства, як, напрыклад, у яшчэ адным вершы-накцюрне: "Ціха па мяккай траве // Сінявокая ноч прахадзіла; // Ціха з заснуўшых палян // Плыў у гару і знікаў, // Быццам дым сіняваты з кадзіла, // Рэдкі прывідны туман..."

Прысутнасць зор на небе — "вянка" чырвоных макаў, які згубіў, плывучы на фоне неба, сон (ці не адсюль паходзіць назва кніжкі "Вянок"?), — бадай што абавязковы жывапісны акцэнт Багдановічавых накцюрнаў. А зямная раса — "пацеркі мілых жоўта-чырвоных агнёў", адлюстроўваючы промні зорак, набліжаюць зямлю да неба, ствараецца дзіўны прыгожы твор — космас, які сведчыць нам пра бясконцасць. У полі зроку вечнасці душа вызваляецца ад дробязных і неабавязковых клопатаў, ад будзённай мітусні.

* * *

Гісторыкі беларускай літаратуры, здаецца, яшчэ не звярнулі ўвагі на адну загадкавую асаблівасць: нашую літаратуру ў пачатку XX стагоддзя стваралі зусім маладыя людзі. І паміралі таксама маладымі. Геніяльнаму аўтару "Вянка" было толькі 22 гады. Сяргей Палуян закончыў самагубствам на дваццатай вясне свайго жыцця. Альфонс Петрашкевіч пражыў 24 гады. Алесь Гарун — крыху больш за 33 гады, з іх 10 прабыў на сібірскай катарзе і ў ссылцы. Аўтару першай "Гісторыі беларускай літаратуры" (1920) было 27 гадоў. Браніслаў Тарашкевіч надрукаваў "Беларускую граматыку для школ" (1918), калі яму споўнілася 24 гады. Аўтарка "Курганнай кветкі" (1914) — дваццацігадовая дзяўчына Канстанцыя Буйло. Сярэдні ўзрост тых, хто найбольш друкаваўся ў "Нашай ніве", "Маладой Беларусі" і "Лучынцы", — недзе каля 22 гадоў. Да трыццацігадовых Янкі Купалы, Якуба Коласа, Антона Луцкевіча, Вацлава Ластоўскага яны звярталіся з павагай — дзядзька. Элаіза Пашкевіч, якой было таксама трыццаць, калі пачыналіся "Наша доля" і "Наша ніва", стала Цёткай беларускай літаратуры.

Трагізм незакончанасці творчага і чалавечага самавыяўлення! І тады, калі яно пачыналася занадта позна, як у Багушэвіча; і асабліва тады, калі жыццё абрывалася на пачатку духоўнага ўзыходжання, як гэта сталася з Мечыславам Бабровічам (Лявонам Гмыракам), аднагодкам Максіма Багдановіча.

Цяжкі крыж выпаў на долю Максіма Багдановіча і ягонае паэтычнае спадчыны. Па характару свайго таленту ён быў паэтам-артыстам, здольным да глыбокага суперажывання і пераўвасаблення. Для такога тыпу мастакоў важна не працягласць душэўнага перажывання і не колькасць жыццёвага вопыту, а іх інтэнсіўнасць і глыбіня. Ці не тут ляжыць ключ для разгадкі феномена Багдановіча? Маю на ўвазе не так раннюю таленавітасць (яна характэрна для ўсіх геніяльных людзей), як нейкую жыццёвую мудрасць, якой Неба і Лёс звычайна надзяляюць не маладых паэтаў, а хрысціянскіх асветнікаў на апошніх этапах іх подзвігу. Тут, як кажуць, — Боскі дар, тайна, якую да рэшты не адгадаеш.

Ёсць, аднак, другі, літаратурны бок гэтага феномена: як мог пісьменнік, жывучы далёка ад сваёй Бацькаўшчыны, так глыбока спасцігнуць схаваныя ад чужога вока скарбы яе быцця і культуры? Ці дастаткова тут адных кніжак, фальклорных, этнаграфічных зборнікаў і слоўнікаў, як думалі крытыкі 20—40-х гадоў і пазней? Як насуперак заходнерускаму асяродзішчу сям'і этнографа Адама Багдановіча здолелі "на вольны свет прабіцца" тыя крыніцы народнай моватворчасці, якія жылі ў душы будучага паэта — спадчынны дар яго таленавітых сялянскіх продкаў?

У 20-я гады І. Замоцін заўважыў: "Калі ўзяць пад увагу, што маленькі Максім пражыў у Гародні першыя пяць гадоў свайго жыцця да пераезду бацькі ў Ніжні Ноўгарад у кастрычніку 1896 года, то нельга не адзначыць гэтых ранніх і, безумоўна, спрыяльных уражанняў ад роднае прыроды, якая адыграла вельмі важную ролю ў развіцці яго паэтычнай творчасці".

**Уладзімір КОНАН.**

**Працяг.**
**Пачатак у №№ 40, 41.**

## З апошніх вернісажаў



**Трое мінскіх мастакоў І. Бархаткоў, У. Кожух, В. Шкаруба паказваюць свае персанальныя выставы ў сталічным Палацы мастацтва.**

**Двое з іх — У. Кожух і В. Шкаруба ўжо ўдзельнічалі ў сумеснай выставе, якая была наладжана пасля іх творчай камандзіроўкі ў зону Чарнобыля. Менавіта тады для шырокага гледача стала вядомым імя Валерыя Шкарубы. Ён зарэкамендаваў сябе як выдатны пейзажыст, які тонка адчувае характар нашай прыроды, раскантактаванасць у адносінах чалавека з навакольным асяроддзем. За прайшоўшыя тры гады пасля той выставы В. Шкаруба напісаў не адзін дзесятак палотнаў. Што на іх? Някідкія нашы краявіды. Размытыя дажджамі вясковыя дарогі, сонныя вёсачкі, занядбаныя могілкі. Сюжэты, якія тысячы разоў ужо пісаліся. Але большасць карцін з гэтымі простымі сюжэтамі нясуць у сабе вялікі філасофскі сэнс, нейкую таямніцу. Не пройдзеш міма, абавязкова мусіш спыніцца, уражаны глыбінёй думак аўтара, планетарнасцю, касмічнасцю яго мыслення, неардынарнасцю светаўспрымання. Вельмі дакладна заўважыла мастацтвазнавец Л. Салодкіна, што на палотнах В. Шкарубы — "суадносіны паміж небам і зямлёй, іх вялікае процістаянне і ўзаемнае пранікненне". Імгненне і вечнасць таксама тут ва ўзаемасувязі. Бадай што, адна з найбольш характэрных творчай манеры мастака работ — пейзаж "Прадчуванне". Аўтар піша дажджлівы, пахмурны дзень. Асаблівая ўвага — на зямлю. Яна нейкая дзіўная, як бы фасфарасцыруе, як бы падае сігнал, што тут небяспечна. Узнікае нават такое ўражанне, што людзей, жывёл і птушак тут няма. Толькі вось гэта безнадзейная зямля, насычаная радыенуклідамі.**

**У. Кожух даўно ўжо ўдзельнічае ў розных выставах. Скончыў акадэмічную майстэрню народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага. Увогуле, мае рэпутацыю "народніка". Па словах мастацтвазнаўцаў, "ён адзін з нямногіх мастакоў, каго лёс простых людзей хвалюе больш, чым мастацкае самавыяўленне". У. Кожух і сапраўды вельмі часта звяртаецца да паказу народнага жыцця. Сам родам з Драгічыншчыны, ён някепска ведае вясковы побыт, тыпажы. Чаго варта адно толькі палатно "Боль"! Жанчына на каленях стаіць на зямлі, просячы ў яе, атручанай, паратунку. Спрацаваныя, вузлаватыя рукі, грубое адзенне, абутак... Яна, гэтая жанчына, зусім не падобна на прыгажунь з экранаў тэлевізараў. У яе зусім іншае, цяжкае, беспрасветнае жыццё. І за што такі лёс?**

**А колькі трагічнасці і цеплыні ў карціне У. Кожуха "Усё жыву і жыву". Старая кабета ўстала з раніцы з ложка. Нялёгкае жыццё ззаду, дзеці раз'ехаліся, хваробы адольваюць. Адзінота. Бязрадаснае існаванне.**

**Падобна таму, як у пейзажах В. Шкарубы ёсць прадчуванне бяды, так і ў карцінах У. Кожуха — даўняе адчуванне трагедыі яго зямлі і народа, да якіх нялітасцівыя былі Бог і гісторыя.**

**І ўсё ж такі ў творчасці "народніка" У. Кожуха не толькі "суровая праўда жыцця", але і прыгажосць народных звычаяў, маладосці, першага кахання.**

**Тонкім эстэтам, каларыстам паўстае "суровы народнік" У. Кожух у серыі сваіх работ "Зёлкі".**

**Бадай што, яшчэ шукае "сваё аблічча" мастак І. Бархаткоў. Яго карціны несумненна таксама выклічуць цікавасць гледачоў, бо аўтар звярнуў сваю пільную ўвагу на царкву. Магчыма, гэта дасць новы імпульс яго творчасці.**

**Т. АНТОНАВА.**

**НА ЗДЫМКАХ: мастакі (злева — направа) Уладзімір КОЖУХ, Ігар БАРХАТКОЎ і Валерый ШКАРУБА на адкрыцці выставы; У. КОЖУХ. "Вянкі палыну".**





На Прыпяці.

Фотаэцюд І. ЮДАША.

# «МЫ ПРЫРОДНЫЯ ГАНЧАРЫ...»

(Заканчэнне.

Пачатак на 7-й стар.).

кашу і боршч, парылі бульбу і малако, пяклі бульбяную "бабку" і здобнае цеста на вялікдзень, салілі агуркі, мялі мак, смажылі яйкі і елі з глінянага посуду. Страва была вельмі смачнай не толькі таму, што гліна, як і іншыя прыродныя матэрыялы, цудоўна захоўвае яе якасці, але і надае ёй своеасаблівы смак. Таму не дзіўна, што нават калі ў краме з'явілася мноства сучаснага посуду, многія надавалі перавагу глінянаму ды драўлянаму. Хто не каштаваў бульбы, варанай у гліняным гаршку, той, даруйце, не ведае, што такое сапраўдная беларуская бульба. А якое смачнае малако з глінянага кубка!..

Гісторыя ўзнікнення глінянага посуду на тэрыторыі Беларусі пачынаецца ажно ў старажытнасці. Першабытныя людзі навучыліся вырабляць з гліны вельмі простыя па форме посуд. З часам мяняліся патрабаванні чалавека, удасканальвалася майстэрства, з'явіўся ганчарны круг. Жыццё само дыктавала формы пасудзіны. Першапачаткова посуд меў завостранае ці сферападобнае дно, каб зручна было ставіць у пясок каля вогнішча. З цягам часу ёмкасці з гліны набывалі ўсё новыя і новыя формы, з'явіліся міскі, збаны, гарлачы, макотры, амфары разнастайных форм, усялякія вырабы з ручкамі, розныя рэчы побыту. У апошні перыяд каменнага веку, што ўвайшоў у гісторыю як эпоха неаліту, вытворчасць керамічных вырабаў атрымала масавы характар на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Удасканальваючыся з года ў год, з веку ў век, з пакалення ў пакаленне, ганчарнае рамяство побач з утылітарнасцю набывала эстэтычнасць. Чалавек навучыўся ўпрыгожваць свае вырабы. Спачатку кропачкамі, рысачкамі, лініямі, потым з'явіліся новыя, больш складаныя матывы малюнка. Вельмі часта сама форма падказвала малюнак прадмета, таму ганчарныя вырабы, знойдзеныя археолагамі падчас раскопак, уяўляюць сабой цікавыя ўзоры старажытнай керамікі, у якіх форма і дэкор — гэта гармонія прыгажосці і практычнасці. Пра гэта сведчаць многія экспанаты, што знаходзяцца ў сховішчах ды экспазіцыях многіх музеяў нашай рэспублікі.

Цікава, што некаторыя вельмі старажытныя тэхналогіі вытворчасці ганчарных вырабаў зберагліся і ў наш час. Гэта датычыцца асабліва чорнай, ці задымленай керамікі. З глыбіні вякоў дайшлі да нас нават некаторыя формы побытавага глінянага посуду. Так, дзеля прыкладу, у залах дасавецкага перыяду Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з унікальнымі чорнымі глінянымі вырабамі, знойдзенымі археолагамі падчас раскопак на Замкавай гары, а на другім паверсе гэтага музея такія ж па форме вырабы задымленай керамікі ўжо знаёмага нам майстра І. Шопіка з вядомага ганчарнага цэнтра Поразава. Дзіву даешся, якія далёкія ў часе і якія адначасова блізкія вырабы нашых прашчураў і сучаснікаў. Што гэта — пераемнасць традыцый, выпадковасць ці заканамернасць?

У даўнія часы вельмі часта ганчарствам займаліся ўсе жыхары вёскі або вуліцы. Часам побач з мужчынамі гаршкі ляпілі і жанчыны. Некаторыя ганчары выраблялі гліняны посуд толькі для сямейных патрэб, а іншыя, акрамя таго, прадавалі яго на кірмашах. Гліняныя вырабы часам аздабляліся самаробнай палівай, пасля чаго яны набывалі прыемнае зялёнае, жоўтае, залацістае адценне. Былі на Гродзеншчыне і так званыя "рабыя", ці "гартаваныя" керамічныя вырабы. Вонкавы выгляд такіх пасудзін вельмі прыгожы — чорна-чырвонымі плямамі. Чым выразней быў гэты своеасаблівы малюнак, тым мацнейшым лічыўся такі посуд.

Ляпілі ў нашым прынёманскім краі таксама пасвісцёлы — разнастайныя цацкі-свістулькі. Для некаторых майстроў гэты занятак часам рабіўся галоўным, нават калі свае дзеці ды ўнукі падрасталі і ставалі дарослымі. Працы кожнага майстра адрозніваліся нечым сваім, уласцівым толькі аднаму, гэтаму чалавеку. Але часам, калі ганчары жылі побач, створаныя імі рэчы мелі некаторае падабенства, набывалі адзіны почырк.

На пачатку нашага стагоддзя ў Поразаве было вельмі шмат ганчароў, а вуліца, на якой жыве цяпер І. Шопік, была наогул "ганчарная". Кожны ляпіў свае гаршкі, але самыя прыгожыя ды лёгкія атрымліваліся ў Шопікаў, дзе гэтае рамяство перадавалася ад бацькоў дзецям на працягу многіх пакаленняў. Жанчыны ў сям'і Шопікаў таксама дапамагалі вырабляць гліняны посуд. Часцей за ўсё менавіта яны націралі вырабы каменьчыкам-"грамушкай" перад абпальваннем. Так яны працуюць і цяпер. Іосіф Шопік выраблае посуд, седзячы за ганчарным кругам, а ягоная жонка апрацоўвае яго каменьчыкам. Потым яны разам любуюцца сваёй працай, калі дастануць з печы прыгожыя вырабы. А каму не хочацца яшчэ раз паглядзець на тое, што створана тваімі рукамі і што прынясе іншаму радасць?!

Іосіф Шопік адзіны ў наш час ганчар у Поразаве і адзін з нешматлікіх на Гродзеншчыне. Вырабамі І. Шопіка ганарацца многія музеі рэспублікі. Серабрыста-чорная задымленая кераміка гэтага майстра з'яўляецца своеасаблівым сімвалам ганчарнага рамяства Прынямоння.

У верасні знакамітаму майстру Іосіфу Шопіку споўнілася 70 гадоў. Дай Божа яму добрага здароўя і новых творчых здабыткаў у такой патрэбнай людзям справе!

**Валянціна ВОЛАХ,**
**загадчыца сектара народнага мастацтва Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.**

# БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ

## МЯСА ПА-БЕЛАРУСКУ

**Мяса (мякаць) нарэзаць, адбіць, пасаліць, перасыпаць дробна нарэзанай цыбуляй і запаніраваць у сухарах. Тушыць з дабаўленнем вады і масла. Падаць з адваранай бульбай і смятанным соусам.**

**600 грамаў ялавічыны, 2 цыбуліны, 2 сталовыя лыжкі цёртых сухароў з чорнага хлеба, 3 сталовыя лыжкі масла, 8 бульбін, 2 шклянкі смятаннага соусу, соль.**

## БУЛЬБА ДАРОЖНАЯ Ў ФОЛЬЗЕ

**Адабраць аднолькавыя па велічыні клубні бульбы, старанна прамыць і паставіць у гарачую духоўку. Бульбу пячы да паўгатоўнасці. Затым загарнуць кожную бульбіну ў фольгу, зноў пакласці ў духоўку і пячы да гатоўнасці. Спечаную такім чынам бульбу можна падаць да стала гарачай ці ўзяць у дарогу. Да бульбы падаць асобна селядцы і масла.**

**10 бульбін, 1 селядзец, 4 сталовыя лыжкі масла, соль.**

## БАБКА БУЛЬБЯНАЯ СА СВІНІНАЙ

**У сырую цёртую бульбу пакласці муку і цыбулю, падсмажаную на сале. Свініну нарэзаць дробнымі кубікамі і абсмажыць. Усё перамяшаць, дабавіць соль і перац. Пакласці ў глыбокую патэльню ці гаршчок, змазаныя тлушчам, і паставіць у духоўку для запякання. Падаць гарачай з маслам.**

**На 10 порцый 1 кілаграм 600 грамаў бульбы, 350 грамаў свініны, 2 чайныя лыжкі мукі, 50 грамаў сала, 2 цыбуліны, 2 сталовыя лыжкі сметанковага масла, соль. Каларыйнасць 1 порцыі 329 кілакалорый.**

## САЛАТА БУЛЬБЯНАЯ З РЭДЗЬКАЙ

**Вараную бульбу нарэзаць тонкімі скрылікамі. Дабавіць нацёртую на тарцы рэдзьку, дробна нарэзаную цыбулю, пасаліць, уліць алею. Усё добра перамяшаць, упрыгожыць зяленівам.**

**На 5 порцый 400-600 грамаў бульбы, 1 рэдзька, 2 цыбуліны, 3 сталовыя лыжкі алею, соль, зяленіва. Каларыйнасць 1 порцыі 246 кілакалорый.**

## ВАРЭННЕ З РАБІНЫ І ЯБЛЫК

**Рабіну прамыць і заліць халоднай вадой. Двое сутак вымочваць, два разы на суткі мяняючы ваду.**

**Зрабіць сіроп, пакласці туды ягады рабіны. Паварыць мінут 15 на слабым агні, кінуць нарэзаныя скрылікамі яблыкі. Зняць з агню гадзіны на дзве. Затым варыць 30-40 мінут на слабым агні.**

**Разліваць гарачым у сухія стэрыльныя слоікі.**

**1 кілаграм рабіны, 1 кілаграм яблык антонавак, 2 кілаграмы цукру, 1 шклянка вады.**

# *СПОРТ*

МІЖНАРОДНЫЯ ШАШКІ. Зоя `Голубева (Садоўская) стала чатырохразовай чэмпіёнкай свету. Першынство праходзіла ў Мінску. На два ачкі меней у кіяўлянкі Ніны Янкоўскай і Карэн ван Літ (Нідэрланды).

ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА. Аляксандр Курловіч заваяваў апошні залаты медаль на чэмпіянаце свету ў Германіі. Беларускі асілак набраў у суме двухбор'я 455 кілаграмаў. На гэтых спаборніцтвах цяжкаатлеты зборнай СССР заваявалі найбольшую колькасць вышэйшых узнагарод — пяць.

ВОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА. Беларускія спартсмены Вугар Аруджаў і Сяргей Смаль сталі пераможцамі першынства свету адпаведна ў вагавых катэгорыях да 48 і 57 кілаграмаў.

Выводзіў чэмпіёнаў на дыван у Варне вядомы барэц Аляксандр Мядзведзь. Ён цяпер не толькі адзін з трэнераў зборнай Савецкага Саюза, але і старшыня Федэрацыі вольнай барацьбы Беларусі.

ГАНДБОЛ. У Базелі адбылася жараб'ёўка адной восьмай фіналу еўрапейскіх кубкавых турніраў.

Сапернікам мінскага СКА будзе французскі клуб "Жырандэн". Першую гульню беларускія гандбалісты правядуць у гасцях у пачатку лістапада.

## ЗАМЕЖНЫМ ПАДПІСЧЫКАМ "ГОЛАСУ РАДЗІМЫ"

**ПАВАЖАНЫЯ СУАЙЧЫННІКІ!**

**Даводзім да вашага ведама, што ў 1992 годзе газета "Голас Радзімы" будзе дасылацца чытачам за мяжу толькі на ўмовах падпіскі. Нагадваем: наш падпісны індэкс 63854, цана — 13 долараў ЗША. Улічваючы, што "Міжнародная кніга" не ў стане якасна выконваць свае абавязкі ў адносінах да замежных падпісчыкаў "Голасу Радзімы", а таксама каб пазбегнуць шматлікіх запытаў у рэдакцыю, дадатковай перапіскі і цяжкасцей у вырашэнні гэтага пытання, грошы за падпіску накіроўвайце на адрас: 220600, г. Мінск, вул. Заслаўская, 10, разліковы рахунак №060070063 у ОПЕРУ Белзнешэканомбанка альбо непасрэдна ў рэдакцыю. Просім усіх, хто прачытае наш зварот, перадаць яго змест сваім землякам.**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.**

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС

220600, МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Газета аддрукавана ў друкарні.
«Беларускі Дом друку»
Індэкс 63854. Заказ № 1578.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12